# *Ліхоўскае возера*



***Знаходзіцца яно недалёка за мястэчкам Пескі, у лесе, па дарозе на Асаўляны. Возера топкае, вельмі глыбокае, заросшае трыснягом, недаступнае.***

***У незапомныя часы на месцы гэтага возера стаяла сяло Ляхавічы. У тым сяле былі гаспадары вельмі багатыя і жылі ў раскошы. Асабліва ў адной хаце жыў багаты гаспадар і меў ён дачку, з якой задумаў ажаніцца малады хлапец, але бедны. Нявеста не хацела выходзіць замуж за яго таму толькі, што ён бедны. Хлопец жа, каб мець жонкай каханую ім дзяўчыну, пайшоў з дому, усё думаючы, якім спосабам зрабіцца багатым.***

***І тады якраз сустрэў едучага багатага купца, забіў яго, выкапаў яму ў хвайніках і засыпаў яго там, а грошы забраў. Прыйшоў за нявестай і кажа:***

***– Цяпер я і сам багаты, можам жаніцца.***

***Але нявеста пачала настойваць, каб ён прызнаўся, адкуль ён мае грошы. Яна настаяла на сваім, і ён павінен быў аб'явіць ёй. І калі расказаў ёй, тады нявеста сказала яму:***

***– Пайдзі на магілу таго, каго ты забіў, ляж і чакай, пакуль не пачуеш, што скажа голас памёршага.***

***Што сказала яму нявеста, тое мусіў выканаць. І калі ляжаў на труне забітага ім, пачуў голас:***

*– Нашто ты мяне забіў? Чакай! За сто год споўніцца кара.*

*Ііайшоў і паўтарыў нявесце пачутыя ім з ямы словы. Пасля нядоўгага роздуму нявеста сказала:*

*– Што будзе праз сто год, мы таго не дачакаем, а на тым свеце Бог рассудзіць, далёка да таго чакаць.*

*Пажаніліся. Жылі дружна, спакойна, у хаце парадак, дастатак. Шчасліва жылі, не ведаючы ніякай бяды, ні ў чым не мелі страты нават сама меншай. Дачакаліся ўнукаў, праўнукаў, прапраўнукаў, і ўсе нераздзельна жылі ў адной сям'і і ў багацтве.*

*Здарылася, ксёндз каталіцкі з мястэчка Пескі, вяртаючыся ад хворага, заехаў нанач у гэту хату.*

*Гаспадыня, старая ўжо, жадаючы пачаставаць ксяндза, пайшла шукаць яек. Між тым, па яе разліках, на тым месцы, дзе куры несліся, аднаго яйка не ставала, не знайшла, а павінна быць. Да таго не прывыклая да найдрабнейшай страты, яе здзівіла гэта, і давай распытваць у нявестак і ва ўсіх дамашніх... І калі ніхто не прызнаўся, што ўзяў яйка, у гневе пачала спярша злёгку сварыцца, а пасля крычаць і лаяцца.*

*Ксёндз перабіў іх спрэчку і пачаў запэўніваць старую, што яму зусім не хочацца есці, а толькі адпачыць. Так і зрабіў. Паклаў на стале кніжку і камэшку, апока да адпачынку. Ксёндз пачаў распытваць старую, чаму дзівіцца, што прапала яйка, такая дробязь:*

*– Ты такая багатая, а шкадуеш нічога няvартую рэч, праз тое хвалюешся сама і хвалюеш сям'ю.*

*– У нашым доме, - адказала старая, - ужо і пастарэўшы, а страты ніякай не здаралася, а то, канешне, у сто год і ў гэты дзень, каб згінуць яйку.*

*– Што ж, відаць, знак... кары божай. Не здарылася нічога асаблівага ў жыцці тваім? - пытае ксёндз. - Раскажы, я прыкмячаю, што асабліва абходзіць цябе страта і што яна асабліва здарылася ў гэты дзень.*

*Старая падрабязна расказала ўсё.*

*Пасля расказа ўсе і ўсё супакоілася ў хаце. Ксёндз лёг за сталом пры акне. Паснулі. Каля пеўняў (у глыбокую ноч) чуе ксёндз лёгкі стук у акно, а пад акном голас:*

*– Ксёндз, уставай і выхадзі.*

*Паўтарыў голас, мала пачакаўшы, і другі раз.*

*Ксёндз паглядзеў у акно - нікога не ўбачыў. Сам сабе не верыць: сон гэта ці напраўду. Раздумвае.*

*Раптам у трэці раз громка паўтарыў голас:*

*– Ксёндз, зараз жа выхадзі, а то загінеш.*

*У здзіўленні і страху ксёндз вялеў свайму чалавеку запрэгчы коней, і паехаў, пакінуўшы ўсіх спячымі.*

***Пад'язджаючы пад Пескі, успомніў, што забыў на стале кнігу з рэчамі і кажа свайму чалавеку:***

***– Выпражы прысцяжнога каня, паедзь верхам і вазьмі маю кнігу і рэчы, яны ляжаць на стале.***

***Чалавек пад'ехаў да таго месца, дзе стаяла сяло, і не застаў нікога і не ўбачыў нічога на тым месцы, апрача вады - возера, а на краі яго - плыве стол, на якім ляжаць кніга і рэчы. Чалавек наблізіўся да берага, стол прыплыў, і ён забраў кнігу з рэчамі, а стол патануў, пайшоў на дно.***